Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 22 (521). Вільня, Нядзеля 4 Чэрвеня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

"Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на пўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ

КНІЖКУ НА ВЁСКУ!

Чытачы нашы, убачыўшы гэты кліч, пачнуць, пэўне, усьмяхацца і барматаць сабе пад нос: „ня маючы чаго лепшага і разумнейшага пісаць, пішуць тое, што само сабою ведама і што сапраўды ў меру магчымасьці робіцца.“

Аднак нам здаецца, што тое, да чаго заклікаем, беларусы агулам, а прадусім, ведама, беларусы інтэлігенты разумеюць мала і мала дацэніваюць і да таго сапраўды мала ў сэнсе нашага клічу робяць.

Галоўнай, агульна-беларускай, мэтай кожнага беларуса зьяўляецца беларускі народ, як поўнапраўны гаспадар на сваей зямлі. Кожны-ж народ да гэткай сваей найвышэйшай мэты даходзіць прадусім праз сьведамасьць такой мэты і праз волю здабываньня яе. Яшчэ пара дзесяткаў гадоў таму многія беларусаў не прызнавалі за народ, а сяньня ўжо падобных галасоў чуем дужа мала. Сьвет сяньня ўжо знае, што мы маем сваю тэрыторыю, на якой жывём, маем сваю гісторыю, якая апісвае нашу мінуўшчыну, маем свой асобны характар, сваю старую культуру, сваю асобную мову і апошнім часам творым сваю літэратуру і навуку, творым сваю сучасную культуру. Гэта ўсё об'ектыўныя факты, якія адмовіць нам характару народу не пазваляюць і аб якіх шырокі сьвет сяньня ўжо ведае. Але апрача об'ектыўных адзнакаў якой групы людзей, каб яна магла звацца народам і апрача об'ектыўных варункаў, у якіх яна магла-б выявіць свой твар народны, патрэбны яшчэ абавязкава варунак суб'ектыўны, гэта знача народная сьведамасьць і воля народнага жыцьця. Праўда, беларускі народ ужо мае ў сабе шмат і гэтай сьведамасьці і гэтай волі, але мае гэтага ўсяго замала, каб магчы змушаць рахавацца з сабой сваіх ворагаў. Справа ў тым, што як паасобныя людзкія адзінкі, так і цэлыя народы, у большай ці меншай меры — залежна ад іх этычнага і агульна-культурнага разьвіцьця — жыцьцё сваё і свае адносіны да іншых людзей і народаў апіраюць на самалюбстве, ад якога каб бараніцца, трэба быць сьведамым сваіх правоў сваіх заданьняў. Вось-жа ў нас гэткай сьведамасьці яшчэ замала і дзеля гэтага часта мы можам пачуць закід з боку нашых розных „апякуноў“, што беларусы здаволены сучасным сваім палажэньнем, ахвотна астаюцца парабкамі і аб сваім самастойным і дастойным жыцьці і думаць ня хочаць.

Адгэтуль ясна, што ўсе нашы высілкі павінны быць сьціраваны на тое, каб будзіць і будзіць беларускую народную сьведамасьць у нашым народзе аж да таго мамэнту, калі народ гэты ня толькі будзе знаць аб сабе, хто ён, — што знае больш-менш і сяньня — але будзе знаць свае народныя, соцыяльныя і палітычныя правы, будзе знаць сэнс і значэньне ўсяго гэтага для сябе і ўрэшце будзе мець няўхільную волю бароцца за свой лёс, за сваю долю, за сваю самастойнасьць.

Для гэткай мэты дасканальна служаць свае школы. Але, як ведаем, беларускія школы нам не даюцца і мы сяньня бяссіляны, каб гэтыя школы здабыць. Дужа карысным бывае ў гэтым роднае духавенства, але ў нас і яно чужацкае.

Дык з гэтай прычыны мы павінны сяньня выкарыстаць дзеля ўспомненай мэты ўсе іншыя даступныя нам спосабы, як усякага роду пазашкольная асьвета, адным з праваднікоў якой будзе іменна беларуская кніжка.

Так, кніжка зьяўляецца сапраўды важным дзейнікам праводжаньня ў жыцьцё ўсякіх ідэяў, а так-жа магутным праваднікам культурным. Ясная рэч, што кніжка і ў справе нашай можа адыграць вялізарную роль. Ідзецца толькі аб тое, як гэту кніжку вёсцы даставіць, асабліва калі возьмем пад увагу сучасны эканамічны крызыс, сучаснае абядненьне нашай беларускай вёскі.

Вось-жа разьлічаць на тое, што вёска беларускую кніжку купіць у такім ліку і ў такім разьмеры, як гэтага вымагаюць яго народна-культурныя патрэбы, няма падстаў, бо зрабіць гэта селянін наш сяньня ня можа. Трэба пайсьці яму на спатканьне. Зарадзіць бядзе ў гэтай справе могуць беларускія выдавецтвы і беларускія кнігарні, якія павінны знайсьці беларускія кніжкі для беларускага сяла, а так-жа падумаць павінны і аб тым, каб гэныя кніжкі дастаўляць на сяло, або за малую цану, або сусім за дарма. Такія танныя або дармавыя кніжкі беларускія выдавецтвы і кнігарні заўсёды маюць. Такімі кніжкамі ёсьць у іх або розныя адбіткі, на якія выдаткі паложаны не вялікія, або розныя кніжкі даўнейшыя, вартасьць якіх ужо хоць больш менш аплачана і якія таварам, пры сяньняшніх эканамічных варунках, быць ня могуць і лёгка могуць быць выкарыстаны для пашырэньня беларускай сьведамасьці і культуры сярод беларускага сялянства. Уважаем, што добры ў гэтай справе дала прыклад беларуская кнігарня „Пагоня“, якая як многія беларускія кніжкі свае ўласныя, а так-жа і некаторых выдавецтваў — з іх, ведама, згоды, — у значным ліку за дужа танную цану, або і сусім дарма, пашырыла сярод беларускага сялянства. Праўда, „Пагоня“, як давед ваемся, не вяла рахункаў, колькі экзэмпляраў кніжак яна пусьціла на сяло, але агулам ведама, што лік гэны быў значны. Спадзяёмся, што „Пагоня“ сваей гэтай сапраўды культурнай і патрыятычнай акцыі не перарве і надалей, а так-жа спадзяёмся, што за яе прыкладам пойдуць і іншыя беларускія выдавецтвы і кнігарні

Спосаб-жа пашыраньня беларускай кніжкі па нашых сёлах дужа просты: едуць з Вільні ў вёску вучні і студэнты беларусы — раздаць ім кніжкі, каб завязьлі з сабой і разьдзялілі, каму ўважаюць за патрэбнае і адпаведнае; прыяжджаюць у Вільню сяляне, заходзяць у беларускія ўстановы — падарыць іх беларускай кніжкай; існуюць гурткі Інстытуту і ТБШ — паслаць ім кніжкі, каб заклалі беларускія бібліятэчкі і рупіліся аб тое, каб беларускае друкаванае слова чыталі найшырэйшыя кругі нашага сялянства.

Словам, кніжка — гэта наш найлепшы прыяецель, гэта магутны праваднік нашых адраджэнска-вызвольных ідэалаў. Сялянства наша гэта добра разумее і дастаўшы кніжку сапраўды з яе карыстае.

Дык дайце беларускую кніжку нашай вёсцы!...

Кнігапісь. (1)

Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства. Кніжка І. Вільня, 1933, бачынаў 209 in 8⁰, з 26-ма ілюстрацыямі ў тэксьце.

Пад гэткім назовам „Беларускае Навуковае Т-ва“ ў Вільні ў пятнаццатыя ўгодкі свайго жыцьця выдала першую сваю кніжку. Разгледзім зьмест гэтае кніжкі.

Аб самым Т-ве.

Наперадзе маем артыкул „Пятнаццаць гадоў працы Беларускага Навуковага Таварыства“, інформуючы аб пятнаццацігодняй гісторыі Т-ва. Артыкул гэты зьявіўся як „Даклад старшыні Ўраду Т-ва А. Луцкевіча на паседжаньні Ўраду 22.XII.1932 г.“ Справаздача галоўна складаецца з пералічэньняў паседжаньняў Т-ва і пастановаў, захаваных у пратаколах. Такой справаздачай здаволіцца немагчыма, але добра, што й гэта ёсьць: яна захоўвуе для будучыні некаторыя ведамасьці з мінуўшчыны Т-ва.

Адзначым тут найважнейшае зьявішча, каторае выразна адбілася ў разгляданым артыкуле. У 1919—1922 г.г. і далей колькасьць сяброў Т-ва расла (бач. 9). У Т-ва ўходзілі ўсе мясцовыя беларусы, могучыя навукова працаваць. Т-ва ўсім ім было сваім, родным, дарагім. Праўда, мала хто з іх навукова працаваў у той час. Залежыла гэта як ад іх самых, так яшчэ ў большай меры ад нягодных варункаў жыцьця краю, неспагадных навуковай працы—зьменнасьці, няпэўнасьці і пад. Нягледзячы на гэта Т-ва крапчэла й давала добрыя надзеі.

Але прышоў 1925 год і першы раз „павеяў большы вецер з усходу“. Вецер гэты павялічыўся ў наступным годзе. Т-ва апынулася ў руках людзей, гнаных гэтым ветрам, і палажэньне зьмянілася. Адны людзі самахоць адыходзяць ад Т-ва, як кс. Ад. Станкевіч і іншыя, якія баяліся далей аставацца ў гэтай рызыкоўнай супалцы пад імем Навуковага Таварыства; другіх аддаляюць „шчырыя й верныя“ ахвяры ветру, бо, каго вецер не нясе, той цяпер „здраднік, непрыяцель працоўнага народу“ і г. д.

Але чым далей, тым вымаганьні растуць, „шчырыя й верныя аказуюцца ўжо ня зусім пэўнымі. І вось „На паседжаньні Ўраду 10.І.1927 г. запоўнены быў прабел, які аказаўся ў працы аднаго з папярэдніх агульных сходаў сяброў Т-ва. Агульны Сход — на прапазыку А. Луцкевіча — абгаварываў справу ўтварэньня сталае Музэйнае Камісіі, але сваіх позытыўных адносінаў да гэтага пытаньня не аформіў у асобнай рэзалюцыі. Дзеля гэтага Ўрад Т-ва і пастанавіў, карыстаючыся з дадзенага яму Статутам права, утварыць сталую Музэйную Раду дзеля адміністрацыйнага і фінансавага кіраўніцтва Музэем, аўтаномную ў сваей грашавой справаздачы—пад беспасярэднім кантролем Ураду. У склад Музэйнае Рады, дзеючае на правох сэкцыі, былі выбраны: А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч і А. Трэпка“ (бач. 13).

ДА ЎСІХ ГУРТКОЎ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ, СУПРАЦОЎНІКАЎ БЕЛАРУСКІХ ГАЗЭТ І СЬВЕДАМЫХ БЕЛАРУСАЎ У ЗАХОД. БЕЛАРУСІ.

Дзеля падсумаваньня і выяўленьня сучаснага стану беларускага школьніцтва і асьветы агулам у Зах. Беларусі, гэтым запрашаюцца ўсе жывыя народна-беларускія сілы падаць у цэнтралі сваіх арганізацыяў або ў рэдакцыі беларускіх газэт наступныя інфармацыі:

1. Ці ёсьць у Вашай ваколіцы беларуская школа і як у ёй вучаць—пабеларуску ці папольску?

2. Як выглядае ўтраквізм школаў афіцыяльна беларуска-польскіх?

3. У якой мове адбываецца навучаньне рэлігіі праваслаўнай і каталіцкай у школах польскіх Вашай ваколіцы?

Пры гэтым падаць, які ўплыў робіць польская школа на беларускую моладзь і якой жадаюць школы для дзяцей бацькі і апякуны.

УВАГА: Падаючы інфармацыю трэба падаць дакладны адрэс школы аб якой апісваецца, а так-жа і свой адрэс.

Вільня, 30.V.1933 г. **СТАРШЫНЯ БЕЛ. НАЦ. К-ТУ.**

Калі пазьней замест усходняга падзьмуў «заходні вецер», яшчэ больш нездаровы й гнілы, дык ад сяброў Т-ва асталася адно невялічкая жменька. Ледзь хапае іх на запаўненьне ўраду і рэв камісіі. Дык ад 1929 г. дагэтуль урад і рэв. камісія астаюцца ў тымсамым складзе (бач. 14 і 16). І хоць ніякай дзейнасьці Т-ва асабліва цяпер нямашака, але «Музэйная Рада» патрэбная, бо й „найвярнейшыя" цяпер перасталі быць вернымі орыентацыйным майстром. Ад 1932 г. (бач. 16) „Музэйная Рада" складаецца з А. Луцкевіча, Р. Астроўскага, А. Трэпкі і Ул. Самойлы. Нягледзячы на скромныя заявы Луцкевіча аб „Муз. Радзе", як аўтаномнай сэкцыі яна зьяўляецца запраўды органам кіраўнічым і вылучна адказным за ўсё, што дзеецца ў Т-ве. Прыкладам-жа гаспадараваньня „Муз. Рады" можа быць такі факт.—У 1931 г. яна з грошаў Нав. Т-ва „пазычыла" 6.700 зл. (глядзі „Бел. Крыніцу" за 1932 г. № 13) „Бел. Выдав. Т-ву", у ўрадзе каторага, як ведама, сядзяць тыясамыя людзі, што і ў „Муз. Радзе". Каб, мусіць, не адлічацца з гэтых грошаў ў „Выдавецкім Т-ве", яго проста зьліквідавалі Гэты факт не знашоў месца ў справаздачы А. Луцкевіча.

Тое, што знаходзім у артыкуле незалежна ад пратаколаў Т-ва, ёсьць і няпоўна і часта няправільна. Зацемім адно некалькі прыпадкаў.

Кажучы, што бібліятэка „Знаніе" Б. Даніловіча перайшла ў Т-ва, аўтор „забываецца" дадаць, што пакуль яе „Музэйная Рада" дзяржала на „схове" ў гімназіі, там яе так „даглядалі", што ад яе асталіся кніжкі толькі малой цаны.

У артыкуле чытаем, што кс. Ад. Станкевіч з сваей падарожы ў Львоў у 1924 г. вярнуўся бяз нічога (бач. 12), тымчасам, як даведваемся з передавіцы мінулага нумару „Б. Крыніцы", ён прывёз адтуль ад аднае асобы тысячу даляраў. Праўда, нейкія даляры спатыкаюцца ў артыкуле ніжэй, але бяз усякае сувязі з асабой кс. Ад. Станкевіча.

У сваей справаздачы А. Луцкевіч кажа, што ў „Бел. Кооп. Банку" ляжыць „звыш 10.000 зл.", назначаных калісь на куплю „Дому Беларускае Культуры" (бач 14). Нельга вытрываць, каб не зазначыць, што грашовая справаздача асабліва павінна быць точная, а ня так агульна „звыш". Смутная гісторыя з гэтымі грашыма. Дастала іх Т-ва тады, калі цяперашняя санацыйная кучка ў ім не панавала. А калі яна непадзельна захапіла Т-ва, дык так задэчыла гэтыя грошы, што яны хіба ўжо шчэзнуць. — Далей, даведваемся, што ў бібліятэцы Музэю Т-ва „да канца 1931 году было скаталёгавана каля 3.000 кніг". Гэта добра, але, як нам перадаюць, калі і далей каталёгаваньне будзе йсьці гэткім тэмпам, як цяперака, дык каталёгу ня будзе і за 20 год.

З гэтых некалькіх зацемак відаць, што справаздача А. Луцкевіча аб 15-гадох жыцьця Т-ва далёкая ад паўніні, а часта й ад праўдзівасьці.

(*Далей будзе*).

прс.

З беларускага жыцьця.

Мэмарыял да Мітрапаліта Праваслаўнай Царквы ў Польшчы зложылі 30 м. м. спалучаныя Прэзыдыўмы Юбілейнага К-ту (25.III.18 і 70-лецьця бел. прэсы) і Бел. Нац. К-ту ў Вільні. — Тэкст мэмарыялу друкуем у сяньняшнім нумары „Бел. Крыніцы.»

Прыймо ў наваградзкую дзяржаўную беларускую гімназію у клясы IV—VIII адчынена. Экзаміны адбудуцца ад 16 да 21 чэрвеня с. г. Да просьбаў аб прыняцьці ў гімназію трэба далучыць: 1) мэтрыку нараджэньня, 2) апошняе школьнае пасьведчаньне, 3) пасьведчаньне дохтара аб паўторным прышчэпе воспы і аб здароўі і 4) экзаміна цыйную таксу 10. зл., у VIII. кл. — 20 злотых.

Падробнасьці з тэхнічных прычын, дамо ў наступным нумары.

Наступны нумар „Бел. Крыніцы выйдзе з датай 15 чэрвеня.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

„Беларуская Школа ў Латвіі." № 3 (20) Рыга, сакавік, 1933 году. Часопісь у гэтым нумары зьмяшчае інфармацыю аб Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі і шырока апісвае аб культурным беларускім руху ў Латвіі. —Толькі чаму часопісь датаваная м-цам сакавіком выходзіць аж у канцы траўня? А пасьля... мова. Ай, мова, мова!

Школьныя падручнікі пабеларуску ў Латвіі. Латвійскі ўрад прыступіў да выдавецтва некалькіх школьных падручнікаў пабеларуску, для беларускіх школ у Латвіі.

З гэтага бачым, што ў Латвіі ўрад дбае крыху і аб беларусах.

Беларускія арганізацыі ў Літве.

(*Паводле надасланай рэляцыі*).

1. Беларускі Цэнтр у Літве. Існуе і працуе з 1 красавіка 1923 году. Гэта найбольш паважная, усестаронная арганізацыя. У склад яе ўваходзяць закладчыкі ўсіх іншых арганізацыяў і такім чынам зьяўляецца асяродкавай арганізацыяй для ўсяго беларускага руху ў Літве.

Першых пяць гадоў Б. Ц. займаўся пераважна выдавецтвам беларускік кніг і падгатоўкай рукапісаў. З 1928 году Б. Ц. пачаў, не пакідаючы выдавецкай працы, займацца больш жывой працай. Ён зьмяшчае цэлы рад стацьцей у Літоўскай і інш. прэсе. Ладзіць цэлы рад дакладаў і дыспутаў на беларускія тэмы. Апавяшчае цэлы рад лекцыяў пабеларуску праз радыё. Дапамагае маральна і матэрыяльна беларусам. Так за апошнія гады было прачытана дакладаў больш 150, з якіх многія былі радыё-даклады. Запамог, пазычак і ахвяр зроблена на суму больш 3500 літаў (каля 3100 зл.). Дадзена праца, галоўным чынам працаўнікам фізычнай працы, у 200здарэньнях і інш.

Б. Ц. ні скуль не атрымліваў ніякай матэрыяльнай дапамогі, усё рабілася коштам ахвярнасьці сяброў Б. Ц. Гэта дужа утрудняла працу, але абараніла Б. Ц. ад наплыву бяз'ідэйнага элемэнту.

Б.Ц. паволі здабыў давер і пашану ў Літвіноў, а так жа папулярнасьць сярод беларусаў.

Б. Ц. у сакавіку мін. г. апавясьціў, што яго мэтай зьяўляецца галоўным чынам: абяднаць і коордынаваць дзеяльнасьць як пасобных беларускіх дзеячоў, так і беларускіх арганізацыяў, займацца культурнай працай. Клапаціцца аб дабрабыце сваіх сяброў, даваць моральную, матэрыяльную і юрыдычную дапамогу і т. п.

На чале Б. Ц. стаіць праўленьне. Старшыня—інж. К. Душэўскі, сэкрэтар—В. Барысовіч, скарбнік—І. Сіротка.

Б. Ц. месьціцца ў Коўні на Лайсвес ал. д. 10 кв. 5.

2. Беларускае Культурна-Прасьветнае Т-ва. У 1932 годзе, стараньнямі і па ініцыятыве сяброў Б. Ц., а так-жа некаторых беларусаў неўваходзячых у склад Б. Ц., было арганізавана Бел. Культ.-Прасьв. Т-ва для мэтаў спэцыяльна школьніцкіх і культурна-прасьветных. Многа зрабіць гэтаму Т-ву яшчэ не ўдалося. Як пойдзе далей праца і ў што выльецца Т-ва,—трудна сказаць: гэта

Мэмарыял

Юбілейнага Камітэту дзеля сьвяткаваньня 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі і 70-тых угодкаў беларускай прэсы і Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні да Мітрапаліта Правасл. Царквы ў Польшчы.

25 сакавіка б. г. ў Вільні мела месца здарэньне, якое па свайму значэньню для ўрэгуляваньня царкоўнага жыцьця ў Заходняй Беларусі (пад Польшчай) зьяўляецца вельмі пагражальным, таму і ня можа быць пакінуты бяз увагі беларускім грамадзянствам.

У працягу вось ужо 15 гадоў Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні ўрачыста сьвяткуе акт абвешчаньня Беларусі Незалежнай і Вольнай Дзяржавай, агалошаны ў Менску 25.III.1918 г. Кожны год гэтае сьвяткаваньне папераджаецца ўрачыстым малебнам у адным з храмаў г. Вільні, прычым сьвяшчэньнік чытае Эвангельле і гаворыць прывітаньне пабеларуску, а хор пасьля малебну сьпявае беларускі рэлігійны гымн. Пачынаючы з 1929 году ў гэты дзень звычайна служацца два малебны: адзін для вучняў Віленскае Беларускае Гімназіі з іх выхаваўцамі, другі — для шырокіх кругоў беларускага грамадзянства.

Прыкладам мінулых гадоў, і сёлета аб'яднанае беларускае грамадзянства мела намер распачаць сваё падвойнае сьвяткаваньне (з 15-мі ўгодкамі абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі злучыўся і другі юбілей: 70-я ўгодкі беларускае прэсы) урачыстым малебнам у Прачысьценскім Саборы, дзе і раней ня раз у гэты дзень зьбіраліся для малітвы беларусы — як праваслаўныя, так і каталікі. Калі з даручэньня адумыслова арганізованага — з ініцыятывы Беларускага Нацыянальнага Камітэту — Юбілейнага Камітэту, які прадстаўляў, *усё аб'яднанае беларускае грамадзянства*, Старшыня Камітэту яшчэ за тыдні два да сьвята зьвярнуўся з адпаведнаю просьбай да прычту Прачысьценскага Сабору, то з боку апошняга атрымаў поўную згоду, на падставе чаго Юбілейны Камітэт і зрабіў абвестку аб малебне ў газэце „Беларуская Крыніца" і друкованых запросінах на ўрачыстасьць. Таксама згодаю сьвяшчэньніка, які меўся служыць малебен, была спаткана і просьба арганізаваць „саборнае" служэньне. Аднак пасьля гэтага раптам зайшла нейкая незразумелая зьмена паглядаў, і Камітэту было запрапанавана духавенствам, замест Прачысьценскага Сабору, прыняць удзел у малебне, які меўся адбыцца „с о б о р н е" ў тую-ж самую гадзіну ў гімназіяльнай царкве. Камітэт ня мог прыняць зробленае яму прапазыкі ўжо нават дзеля адных тэхнічных умоваў — дзеля таго, што гімназіяльная (Пятніцкая) царква вельмі малая і не магла б зьмясьціць вучняў гімназіі з іх вучыцялямі, і грамадзянства, якое чакала малебну з поваду падвойнага нацыянальнага сьвята беларусаў Таму было пастаноўлена прасіць Арх. Феадосія багаславіць каго-колечы з духавенства адслужыць — хай сабе і не „соборне" — малебен усё-ж такі ў Прачысьценскім Саборы, бо аб гэтым было ўжо шырока абвешчана. З гэтаю мэтаю са складу Камітэту была выбрана асобная дэлегацыя, якая і зьвярнулася 22.III да Архіепіскапа Феадосія з вышэй успомненаю просьбаю. Архіепіскап прыняў дэлегацыю вельмі прыхільна і абяцаў зрабіць распараджэньне адслужыць малебен „у парадку трэбы". Аднак у апошнюю хвіліну іераманах Сьвята-Духаўскага манастыра, які напярэдадні асабіста даў Старшыні Камітэту сваю згоду, раптам „захварэў" (хаця дэлегацыя ў той-жа самы дзень бачыла яго здаровым), аб чым і паведаміў пісьмом Старшыню Камітэту за гадзіну да малебну. Тады дэлегацыя, каб выясьніць справу і выратаваць прыкрую сытуацыю, безадкладна зьвярнулася ізноў да Арх. Феадосія. Архіепіскап адказаў дэлегацыі, што да справы гэтае прымяшалася „политика", што духавенства хоча заставацца „лёяльным" да ўлады і што нікому з духавенства Ён, Архіепіскап, „прыказаць" ня можа. З гэтага ясна было, што духавенствам згодна прынята пастанова ня служыць у Прачысьценскім Саборы, і дэлегацыі засталося толькі прыняць гэта да ведама.

Тымчасам перад Саборам сабралося ўжо шмат людзей з віленскага беларускага грамадзянства, як праваслаўных, так і каталікоў. Прыйшлі на малебен і прыехаўшыя спэцыяльна на ўрачыстасьць госьці: трое паслоў Украінскага Пасольскага Клюбу, на чале з Старшынёю Клюбу д-рам Д. Левіцкім, рэдактар украінскага „Діла", некалькі ксяндзоў-беларусаў і інш. Ня трэба казаць, што нічым неапраўданая і зусім неспадзяваная адмова духавенства зрабіла на ўсіх прыйшоўшых вельмі прыкрае ўражаньне. Усе ў адзін голас адкрыта выражалі сваё абурэньне і тлумачылі гэты факт, як зьдзек, як абразу ўсяму беларускаму грамадзянству. І свайго роду пратэстам проці такога бяспрыкладнага захаваньня духавенства сталася ўсё тое, што пасьля гэтага было, іменна: усе прысутныя, да апошняга чалавека, увайшлі ў адчынены храм і тут с а м а ч ы н н а — разумеецца, пры захаваньні ўсяе павагі і пашаны да сьвятыні— адсьпявалі беларускі рэлігійны гымн. Пасьля гэтага спакойна разыйшліся.

Вось здарэньне, якое дало повад Юбілейнаму Камітэту і Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту ў Вільні зложыць гэты мэмарыял Вашаму Блажэнству.— Як-бы ні тлума-

будзе залежыць у значнай меры ад дзейнасьці праўленьня Т-ва. Некаторым сябрам Т-ва, а так-жа сябрам праўленьня закідываюць тое, што яны паднялі грызьню сярод беларусаў і пачалі бесканечныя спрэчкі. Гэта адстрашыла многіх, найбольш паважных беларусаў і яны выступілі з таварыства. Дзеля гэтага Бел. Культ.-Прасьв. Т-ва траціць папулярнасьць сярод беларусаў і пашану ў літвіноў. На чале Бел. Культ.-Пр. Т-ва стаў С. Якавюк і В. Боеў (расеец).

Бел. Культ. Т-ва месьціцца ў Коўні на Лайсвес ал. № 26.

3. Хаўрус беларусаў Літвы. Арганізацыя створана толькі сёлета (у сакавіку 1933 г.) і яшчэ нічым сябе ня выявіла. Самі арганізатары ня могуць вытлумачыць яе мэтаў. Здаецца яна створана з мэтай конкураваць з Беларускім Цэнтрам. Некаторыя закладчыкі Х.Б.Л. ўгледзілі памылковасьць свайго кроку і думаюць, што Х.Б.Л. сам сабой зьліквідуецца. На чале Х.Б.Л. стаяць тыя-ж В. Боеў і С. Якавюк. Месьціцца там-жа дзе і К.-Пр.Т-ва.

4. Аб'яднаньне Студэнтаў Беларусаў Літоўскага, Вітаўта Вялікага, Унівэрсытэту. Арганізацыя чыста акадэміцкага характару, налічвае сябраў каля 15 чалавек.

5. Літоўска-Беларускае Т-ва. Асобна стаіць аснаванае па ініцыятыве Беларускага Цэнтру і Літоўскіх дзеячоў арганізацыя прызначаная ўзаемнаму пазнаньню і зблізкэньню двух народаў — беларускага і літоўскага. Арганізацыя паўстала толькі ў 1933 годзе і трудна сказаць, у што яна вырьецца, але імёны асоб, якія ўвайшлі ў склад Т-ва, даюць магчымасьць думаць, што яно будзе працаздольнае і паважнае. З літвіноў паміж іншымі ўвайшлі прафэсары: М. Біржышка, Аугустанціс, Вольтэр, Вайліоніс, З. Жэмайціс; апрача іх: д-р Пурыцкі, інж. Аукштуоліс і многа іншых. З Беларускага Цэнтру ўвайшлі прафэсары: Лаппо, Т. Іваноўскі, а так-жа інж. Душэўскі, Г. Іваноўская, В. Барысовіч, І. Сіротка, Ясінскі, прот. І.Корчынскі і шмат інш.

Рэшта назоваў. Больш беларускіх арганізацыяў у Літве няма. Ёсьць толькі сэкцыі ці інстытуцыі Беларускага Цэнтру (прыкл. Курсы Грамадзкіх Навук і Беларусаведы і інш.), або Культурна-Прасьветнага Т-ва (прыкладам Тэатральная сэкцыя і інш.).

У Беларускім Цэнтры разглядаецца справа магчымасьці ўтварэньня паразумеваўчага органу кшталтам Нацыянальнага Камітэту, але яшчэ да акрэсьленых вывадаў у гэтай справе ня дойдзена.

З Польшчы.

Што выяўляе справаздача выкананьня бюджэту за 1932-33 год. Мы ўжо падавалі агульны вынік выкананьня дзяржаўнага бюджэту за 1932-33 год. Цяпер заглянем колькі і з якіх галін гаспадарчых сьцягнена падаткаў. Вось-жа:

Падатку прамысловага дзяржаўны скарб меў набраць 230 мільёнаў зл., а сабраў толькі 195 мільёнаў зл. Падатку ад даходаў мела быць 280 мільёнаў зл., а набралася ўсяго 192 мільёны зл. Падатку ад маемасьці спадзяваліся 20 мільёнаў зл., а сабралі толькі каля 14 мільёнаў зл., і г. д. Адзін толькі падатак грунтовы сьцягнена з найбольшай шчырасьцяй, бо больш на 9 мільёнаў зл. ад папярэдняга году — 54 з палавінай мільёнаў зл.

З гэтага выглядае, што ў іншых гаспадарчых галінах узяты пад увагу гаспадарчы крызыс, а ў адносінах да земляробства гэна ўвага найменш была застасавана.

Закрыцьцё цукроўняў. Польскі картэль (саюз) цукроўнікаў закрывае ўсьцяж меншыя фабрыкі цукру,—цукроўні. Гэтакім спосабам закрыта ўжо ў Польшчы 10 цукроўняў, а цяпер мае быць закрыта яшчэ 6 гэткіх фабрыкаў. Гэта прыходзіцца тлумачыць тым, што ў Польшчы зьменшылася спажыцьцё цукру. Але і нічога дзіўнага, бо сялянства ня мае за што купіць нават солі, дык ад цукру адказацца мусіць.

Незважаючы на гэта картэль цукроўнікаў цаны на цукар не абніжае. А на гэтым цярпіць земляробства, работнікі і спажыўцы.

Паварот да дзераўлянай сахі. Польшч земляробскай культурай прад эўропэйскімі дзяржавамі пахваліцца ня можа. Земляробская культура ў Польшчы даволі ня высокая. Але і гэтая культура апошнімі гадамі пачала ўпадаць. Аб гэтым сьведчыць наступны факт.

Цэнтральны Саюз Польскага Промыслу падае, што цяпер абарот земляробскіх машын у Польшчы ледзь асягае ад 1 да 2 процантаў абароту 1929 году; абарот земляробскіх прыладаў ледзь асягае 4 працэнты абароту 1929 году. Словам, промысел машын і земляробскіх прыладаў у земляробскай Польшчы ўпадае. А гэта паказвае, што земляробства Польшчы варочаецца да дзераўлянай сахі.

6 гадоў турмы за надужыцьцё дзяржаўных грошай. Праз доўгі час цягнуўся ў Варшаве суд над інж. Рушчэўскім, які, будуючы

З заграніцы.

Лёс Эўропы ўсё рашаецца. За апошнія два тыдні, калі Італія праз сваіх амбасадараў у Англіі і Францыі падгатаўляла зарганізаваньне блёку 4-х вялікіх дзяржаў у Эўропе (Італія, Нямеччына, Англія і Францыя), Нямеччына скіравала ўсе свае дыплёматычныя сілы ў Амэрыку і ў Англію.

Амэрыка глядзіць на Эўропу выключна з пункту гледжаньня сваіх гаспадарчых інтарэсаў. Дзеля гэтага паехаў туды прэзыдэнт нямецкага дзяржаўнага Банку д-р Шахт. Ен вёў перагаворы з прэзыдэнтам Зл. Шт. Амэрыкі Рузвэльтам, з каторым выдалі супольны камунікат, што між Нямеччынай і Амэрыкай асягнута гаспадарчае паразуменьне, а дзеля гэтага яны спадзяюцца хуткага аздараўленьня сусьветнай гаспадаркі.

Адначасна выехаў у Англію кіраўнік заграмічнай палітыкі партыі Гітлера — Розэнбэрг. Уся жыдоўская прэса, а за ёй і прэса польская, зьвярнула найбольш увагу на тое, як спатыкалі ў Англіі Розэнбэрга жыды. Розэнбэрг, не зьвяртаючы ўвагі на настроі жыдоў, вёў у Лёндыне перагаворы з англійскім міністрам заграмічных спраў і іншымі англійскімі палітыкамі, а ў гэтых перагаворах памагаў Розэнбэргу італьянскі амбасадар. Акрамя таго Розэнбэрг выклікаў з Амэрыкі Д-ра Шахта, каторы ўжо 19 траўня навязаў зносіны з прэзыдэнтам англійскага дзяржаўнага Банку — М. Норманам.

Пасьля гэтай нарады Шахта з М. Норманам, дэлегат Нямеччыны на конфэрэнцыі разбраеньня ў Жэнэве заявіў, што Нямеччына згаджаецца з плянам Англіі ў справе разбраеньня. Да заявы прадстаўніка Нямеччыны прылучыліся і дэлегаты Амэрыкі і Францыі.

Такім чынам асягнута аснаўная згода аб разбраеньні між Амэрыкай, Англіяй, Італіяй, Нямеччынай і Францыяй.

Польшч і дзяржавы Малой Антанты сваей згоды на гэткі пакт яшчэ ня выявілі. Ды ці гэта каму цікава?

Адсрочка конфэрэнцыі разбраеньня. Га-

будынкі для міністэрства Пошт і Тэлеграфаў, надужыў дзяржаўны скарб.

Суд прызнаў Рушчэўскага ў гэтай справе вінаватым, засудзіў яго на 6 гадоў у турму й прысудзіў зыскаць ад засуджанага 1.314.963 зл. на карысьць скарбу, як зварот няпраўна выбраных грошай.

чыць захаваньне Віленскае Епархіяльнае Улады і духавенства, але факт застаецца фактам: духавенства просьбу ўсіх аб'яднаных беларускіх грамадзкіх арганізацыяў адкінула, адмовіўшыся ў апошнюю хвіліну адслужыць малебен нават „у парадку трэбы". Юбілейны Камітэт ня зьбіраўся рабіць з малебну якоекольечы палітычнае дэмонстрацыі і протэстуе супроць такога кваліфікаваньня яго Епархіяльнай Уладай. Як наша царкоўная ўрачыстасьць, так і адбытая ўвечары ўрачыстая акадэмія была арганізована з папярэдняга ведама і дазволу адміністрацыйнае ўлады. Камітэту хадзіла толькі аб малітву, толькі аб захаваньне прыгожае царкоўнае традыцыі, якая вось ужо на працягу 15-цёх гадоў аб'еднывае ўсіх беларусаў, бяз розьніцы веравызнаньня. Ніколі на працягу 15-цёх гадоў гэты малебен ня лічыўся палітычнай дэмонстрацыяй, і само Віленскае духавенства, можна сказаць, ніколі раней гэтак яго не трактавала, і заўсёды больш-менш ішло насустрэчу грамадзянству. Тым больш нам крыўдна, што за паўтары гадзіны перад вызначаным малебнам адбылося, бяз ніякіх перашкодаў, арганізованае тым жа самым Юбілейным Камітэтам урачыстае багаслужэньне ў касьцеле сьв. Мікалая, падчас якога былі прысутнымі і шмат праваслаўных. Там было і высоканатхнёнае казаньне ў беларускай мове, там быў адсьпяваны хорам і ўсімі прысутнымі беларусамі беларускі рэлігійны гымн. І ніхто не палічыў гэтага багаслужэньня нейкай замаскаванай палітычнай дэмонстрацыяй.— Калі гаварыць аб палітыцы, дык палітыку ўнясло тут іменна само духавенства праваслаўнае,— унясло тым, што для аднэй групы беларусаў згадзілася служыць малебен і запраўды служыла, дый яшчэ ўрачыста, другой-жа групе, якая прадстаўляла аб'яднаны беларускі народ, адмовіла, ня гледзячы нават на данае раней абяцаньне. Але мы павінны зазначыць, што ў Пятніцкай царкве духавенства служыла ня з шчырай прыхільнасьцяй да беларускага нацыянальнага руху, а дзеля нейкіх іншых пабудак палітычнага характару, бо адносіны праваслаўнага духавенства да справядлівых дамаганьняў беларусаў у галіне рэлігійнага жыцьця былі заўсёды выразна нэгатыўныя і не маглі раптам радыкальна зьмяніцца. Ці трэба больш выразнага доказу варожасьці духавенства спэцыяльна да справы гэтак зв. беларусізацыі царквы і да беларускай нацыянальнай ідэі наагул, як, напрыклад, яшчэ нядаўняя пастанова Зьезду Духавенства Віленскае Епархіі 1—3 сакавіка 1932 г., у якой Зьезд катэгорычна і надоўга, калі не назаўсёды, адмовіў беларускаму народу права на ўжываньне ў царкоўным жыцьці яго роднае мовы і наагул права на самастойнае нацыянальнае і культурнае разьвіцьцё (гл. „Голас Праваслаўнага Беларуса" 1.III.1932 г. № 3).

Здарэньне 25.III. б. г. наагул ня можна разглядаць па-за ўсёю сыстэмаю ці характарам адносін Вышэйшае Царкоўнае Ўлады да беларускага царкоўнага пытаньня. Яно ёсьць лёгічным вынікам гэтае сыстэмы. Поўнае і сталае ігнараваньне ўсіх найістотнейшых і найсправядлівейшых дамаганьняў беларускага народу ў галіне царкоўнага жыцьця — вось найбольш характэрная азнака гэтае сыстэмы. Каб не палічылі нас галаслоўнымі, падамо некалькі найбольш яскравых фактаў:

1) нідзе на лекцыях Закону Божага ў школах розных тыпаў беларуская мова не зьяўляецца моваю выкладовую для дзяцей беларусаў праваслаўнага веравызнаньня; усюды ў школах непадзельна пануе мова польская або расейская;

2) сынадальная друкарня, у якую-ж пэўне плывуць грошы і з беларускага праваслаўнага насяленьня, за ўвесь час існаваньня аўтакефальнае Царквы і раней, не паклапацілася дасюль выдаць **а ніводнага падручніка** праваслаўнае рэлігіі, а ніводнага малітваслова (з царкоўна-славянскім і беларускім тэкстам), а ніводнае хаця-бы самае маленечкае кніжачкі рэлігійнага зьместу ў беларускай мове, хаця за той-жа самы час знайшліся сродкі і магчымасьці выдаць падручнікі па Закону Божаму для пачатковых школаў: у польскай мове — 5, у расейскай мове—7 і паўкраінску — 8 (гл. „Воскресное Чтеніе" 22 I.1933 г. № 4), — хаця беларусы-сэктанты, якіх шмат плодзіцца па ўсім прасторы нашае зямлі, ужо маюць поўны канон кніг Новага Завету і багатую духоўную літэратуру ў беларускай мове; таксама і уніяты, якія рэгулярна выдаюць пабеларуску журналы, брашуры, календары і г. д.

3) духавенства праваслаўнае, — скажам славамі адозвы Вашага Блажэнства за 1-е жніўня 1928 г., — „не выкарыстоўвае аднаго з наймагутнейшых спосабаў уплыву жывым словам на сваіх прыхаджан" і дасюль, як і раней заўсёды, „занядбоўвае свой абавязак навучаньня Слова Божага ў роднай мове, якая зьяўляецца адным з найдаражэйшых скарбаў кожнага народу";

4) Вышэйшаю Царкоўнаю Ўладаю нічога ня зроблена і ня робіцца для таго, каб прадстаўнікі Епархіяльнае Ўлады, як і сьвяшчэньнікі ў прыходах, былі духова і нацыянальна зьвязаны з беларускім народам. Віленская Духоўная Праваслаўная Сэмінарыя ня толькі ня робіць ніякага поступу ў сэнсе беларусізацыі, але наадварот, з кожным годам больш і больш набывае аблічча, якое ёсьць пагрозай ня толькі мо' нацыянальнаму духу гэтае школы, прызначанай узгадоўваць кадры праваслаўнага духавенства для Заходняй Беларусі —

і 5) Вышэйшаю Царкоўнаю Ўладаю ні-

зэты падаюць, што цяпер пакульшто мае быць адложана конфэрэнцыя разбраеньня ці лепш сказаць — спынена ўзноў на нейкі час распачатая ажыўленая ў гэтай справе гутарка. Прычына гэтай адсрочкі: нязгода дзяржаў Малой Антанты і Польшчы, а найгалаўнейшая — набліжаючаяся лёндынская конфэрэнцыя, якая, спадзяюцца, мае прычыніцца да мацнейшага аб'яднаньня 4-х вялікадзяржаў Эўропы, а так-жа далучэньня да іх і многіх дзяржаў меншых.

Выбары ў Гданску. У мінулую нядзелю 28 м. м. адбыліся ў Гданску выбары ў сойм. Вынікі выбараў наступныя: гітлераўцы здабылі 38 мандатаў, социялісты — 13, камуністы—5, цэнтр—10, нямецкія народнікі—4, палякі — 2.

Гэта ўжо пятыя чарговыя выбары ў Вольным месьце Гданску. Апошнія выбары адбыліся 16 лістапада 1930 г. Тады здабылі найбольш мандатаў социялісты. Пасьля зьмены констытуцыі сойм складаўся з 72 паслоў: 25 паслоў левых, цэнтр — 10, каталіцкі цэнтр—11, гітлераўцы—12, палякі —2... Соймавая кадэнцыя трывала 4 гады.

З гэтага бачым, што гітлераўцы перамагаюць і ў Гданску, а палякоў там зусім няшмат ёсьць.

Кітайска-японскае перамір'е падпісана дня 31 м. м.

8 ВІЛЬНІ

Лжы, ды меру знай! Галоўны махер — у супалцы з Р. Астроўскім — ад справы перадачы Віленскай Беларускай Гімназіі паляком, А. Луцкевіч, у № 11 свайго дэфэнзыўнага органу „Родны Край" на каго іншага ў гэтай справе складае віну (ён ад гэтага майстар, але работа гэта безнадзейная! — п р ы п. д р у к а р а). Гаворачы аб сёлетнім звальненьні некаторых вучыцялёў з гэтай гімпазіі (ў тым ліку і Кс. А. Станкевіча з прычыны палітычнай „неблагонадзёжнасьці" - п р ы п. д р у к.), прыпамінае, што і ён, Луцкевіч, у сваім часе быў звольнены за „неблаганадзёжнасьць". Вось-жа падчорківаем, што А. Луцкевіч быў звольнены з гімназіі не за нястачу „благонадзёжнасьці", бо гэтай у яго прад польскім урадам, як аб гэтым усім добра ведама, хватае даволі,—а што звольнены ён быў проста з прычыны нястачы навуковых кваліфікацыяў: ён ня мае скончанай вышэйшай асьветы.

Дык, пане Луцкевіч, „калі ня поп — ня ўбірайся ў рызы!"

Курс грашэй. За даляр 7.44—7.45 зл.; за рубель золатам — 4.90.

Зьдзічэньне. У панарскім лесе пад Вільняй 31 м. м. пастухі знашлі недагарак людзкога трупа. Ёсьць гэта новая ахвяра „гарадзкой культуры".

Да нас пішуць.

Цемра нішчыць беларусаў.

(Панюцічы, Сноўскай гм., Нясьвіскага пав.)

Гадоў тры таму, як заснаваўся ў нас гурток польскай арганізацыі „Стоважышэня млодзежы." Запісалася ў гэты гурток некалькі хлапцоў — праваслаўных беларусаў. Нічога яны там не рабілі і ня робяць, а прэзэс гэтага «кола» робіць адно, што ходзіць да Паўліны. Ды няхай сабе „ходзіць..." Апрача гэтага прысылалі ў гэта „кола" польскую газэту „Млода Весь," але ніхто яе ня чытаў. Вось і ўся работа гэтага «кола."

Поруч з польскім „колам" пачала пранікацъ у нашу вёску і свая беларуская сьвеДамасьць. Сьведамейшыя хлопцы задумалі зладзіць сёлета на Вялікдзень беларускае прадстаўленьне. Навучыліся йграць п'есу „Птушка Шчасьця і прыступілі да падгатоўкі самага прадстаўленьня. Дачуўся аб гэтым прэзэс польскага „кола" і ведаеце, што зрабіў? — выслаў у старастава пратэст, каб у нашай вёсцы ня ладзілася беларускае прадстаўленьне. Стараста дазволу на беларускае прадстаўленьне то ня даў, але дзеля якой прычыны — няведама. Пасьля гэтага прыяжджаў у нашу вёску і інструктар польскага „стоважышэньня" ды навучаў, як даглядаць курэй і козаў ды радзіў сарганізаваць аркестру. Людзі нашы, ведама, слухалі, але ніхто нічога не зразумеў, дык толькі пасьля сьмяяліся. З гэтага сьмеху пачалася сварка, а пасьля і бойка.

Дарагая, беларуская моладзь! Кінь Ты ўсё чужое і вазьміся за сваё роднае. Залажы сваю родную беларускую арганізацыю прыкладам Гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, выпішы родныя газэты, як «Шлях Моладзі", залажы бібліятэку і прасьвячайся. Стары Беларус.

Нацыянальная сьведамасьць узгадоўвуе моральна.

Ласіца, Постаўскага пав. Пакуль чалавек ня бачыць добрага, дык ня ведае што ёсьць благім. Гэткае было паняцьце аб добрых і благіх пастухах аж да гэтай пары ва ўсім нашым Ласіцкім прыходзе.

Я вельмі цяпер цікаўлюся, што думае архірэй, пасылаючы сьвяшчэньніка ў вясковы прыход на Беларусі. Сьпярша я думаў, што архірэй дбае аб душу нашага народу, але цяпер дык я пачаў думаць інакш. Мне здаецца, што архірэй і большасьць духавенства робяць сваю работу вот абы рабіць і пры гэтым сьцерагуць, каб ня выкінуць з царквы на Беларусі расейшчыны. Гэтак робячы ўважаюць яны наш народ мусіць надта-ж цёмным, з якім і лічыцца ня трэба. Але яны надта мыляюцца. Наш народ і ня зусім цёмны, а толькі загнаны і нацыянальна не даволі сьведамы. Пакуль яму гавораць у царкве аб справах адарваных ад жыцьця і ў чужой мове,—думае, што гэтак у царкве і трэба. А як пачаў сьвяшчэньнік гаварыць пропаведзі пабеларуску і аб справах блізкіх да жыцьця і жыцьцёвых, дык народ зразумеў, што так, як было ўпарод, было нядобра, бо цяпер куды ясьней і многа карысьней.

Быў у нас настаяцелям сьвяшчэньнік Кадлубоўскі, гаварыў ён пропаведзі і да народу парасейску. Слаба людзі яго разумелі, але ўважалі, што гэтак і „трэба," каб мала чаго ведаць аб навуцы Хрыста. Захварэў а. Кадлубоўскі і паехаў у Вільню лячыцца. На яго мейсца прыехаў сьвяшч. Маеўскі. Казалі, што нават ён беларус, але беларускага ад яго ніхто нічога не пачуў. Ён увайшоў у хаўрус з асаднікамі і пачаў жыць надта-ж паводле цяперашняй гарадзкой цывілізацыі. Царква тады зусім апаражнела: людзі дэманстрацыйна ня йшлі ў царкву. Але, дзякаваць Богу, выехаў ад нас Маеўскі, а на яго мейсца прыехаў а. Ал. Коўш. Знаці нашы людзі толькі з газэт і думалі, што газэты хваляць людзей вот «абы пісаць,"а цяпер нашы людзі аддаюць большую пашану і газэтам і а. Каўшу. І ёсьць за што яго шанаваць. А. Коўш сваімі пропаведзямі — а гаворыць ён іх пабеларуску —уліў у душу народу нашага прыхода вялікую любоў да ўсяго роднага і да суседніх рэлігіяў. Засыпаў ён ужо той роў, які дзяліў нямігасэрна нашых праваслаўных беларусаў з братамі каталікамі. Словам, а. Коўш уліў у душу нашага прыходу сапраўдную любоў да свайго народу. Захвоціў ён ужо нашых людзей да роднай кніжкі, да родных песьняў; нашы дзеці цяпер ужо вельмі прыгожа сьпяваюць беларускія песьні. А прыгожыя беларускія песьні, дык і наслухацца трудна.

Дык дай-жа Божа, каб такіх а. а. Каўшоў было ў нас больш, дык і народ наш стаўся-б тады сьвятлейшым. Цяпер царква ў нас ужо ня пустуе: народу на набажэнстве заўсяды поўна. Бо ёсьць ахвота йсьці цяпер ў царкву і зачэрпнуць там шмат карыснага сабе ў душу. Прыхаджанін.

чога ня зроблена і ня робіцца для таго, каб у падгатаваўчых да Ўсяпольскага Праваслаўнага Сабору працах прадсаборных камісіяў прынялі ўдзел і прадстаўнікі беларускага праваслаўнага народу.

На фоне вось такой палітыкі здарэньне 25.III. б. г. — паўтараем — зьяўляецца зусім зразумелым і лёгічным. Беларускае грамадзянства разглядае яго нават як „шаг наперад" у гісторыі адносін кіраўнічых царкоўных сфэраў і духавенства да беларускага царкоўнага пытаньня. Духавенства, пакорна ідучы за ўрадавым курсам, пачынае ўжо актыўна змагацца з беларускім адраджэнскім рухам на царкоўным грунце, пачынае — ёсьць факты — умешвацца ў барацьбу розных палітычных орыентацыяў між беларусамі, як быццам яно можа навгул забіраць голас у гэтай барацьбе, застаючыся само такім адарваным ад народнага жыцьця, такім чужым і проста варожым да ўсяго, што ёсьць беларускім.

Гэта мо' самая балючая справа нашае сучаснасьці, на якую ўжо шмат разоў зварочвалася ўвага Вашага Блажэнства нашымі грамадзкімі арганізацыямі. Між духавенствам і беларускім народам запраўды лягла вялікая прорва. Духавенства праваслаўнае, адарванае ад народу, не адчувае народнае ідэі, якая прысьвячае яму ў яго нярадасным жыцьці, якую народ беларускі ўзгадаваў вякамі няволі і пакуты і якая асабліва знаходзіць цяпер свой водгук у грамадзкай працы найбольш сьвядомай і адданай беларускай моладзі, гатвай дзеля гэтае ідэі на ўсялякія ахвяры. Не адчувае, таму і ня можа падняцца вышэй за казённае, фармальнае выконваньне сваіх абавязкаў, таму і працівіцца нацыянальнаму адраджэньню на грунце царкоўным, хаця яно было-б адначасна і рэлігійным адраджэньнем нашага народу. Такім пастырам, асабліва калі яны яшчэ ставяць перашкоды на шляху народнага ўсьведамленьня (ведамы і гэткія прыклады), ня можа быць з боку пасомых належнае пашаны і даверу. Таму і кідаюць яны „двор оўчы", таму — на раздарожжы — і робяцца лёгка ахвярамі сэктанства, бязбожжа і чужаверра. Беларускае грамадзянства глыбака пераконана, што іменна духавенства, гэткае раўнадушнае да духовага жыцьця свае паствы, стварае грунт для рэлігійнага індыфэрэнтызму, сэктанства і няверра. Усім гэта відно, адна толькі Царкоўная Ўлада, здаўшыся на афіцыяльныя рэляцыі а. а. благачынных і Кансысторый, ня бачыць, як адбіваецца народ ад царквы, як цэлыя вёскі моральна дзе-ючь і раскладаюцца, як у прыходах, дасюль заўсёды моцных сваім праваслаўным духам, цяпер знайшлі гасьціннасьць і пяцідзесятнікі, і баптысты, і мэтодысты, і талстоўцы і інш., — ня бачыць, таму яна і ня прыймае патрэбных спосабаў барацьбы з усімі гэтымі балячкамі нашага царкоўнага жыцьця. Ня кажам ужо, што з кожным днём усё больш і больш рэальнай зьяўляецца пагроза для Праваслаўнай Царквы з боку Уніі, для барацьбы з якой у нас абсолютна нічога ня робіцца, асабліва ў галіне друкованага беларускага слова. Было-б вялікай памылкай думаць, што запабегчы гэтай бядзе могуць нейшы афіцыяльныя місіянэры. Адзіны магчымы тут ратунак, які падказваецца і ўсёй мінулай гісторыяй Праваслаўнае Царквы на Беларусі — гэта рээрганізацыя царкоўнага ладу на грунце шырокага ўчасьця народу ў жыцьці Царквы і запраўднае зьбліжэньне духавенства з народам, якому-б яно было роднае і блізкае сваім паходжаньнем, моваю, усім складам свайго жыцьця і псыхікі. Калі Праваслаўная Царква на Беларусі не загубілася, ня зьнішчылася сярод асабліва цяжкіх XVII—XVIII вякоў, дык гэта перш за ўсё дзякуючы кроўнай спаяннасьці вясковага духавенства з народам і супольнасьці іх жыцьця і інтарэсаў.

Віленскае здарэньне 25.III. б. г. як нельга больш ілюструе ўсё тое адчужэньне, увесь недавер, які ляжыць між духавенствам і масамі беларускага народу і ў якім крыецца найбольшая небясьпека для Праваслаўнае Царквы на Беларусі. Падвойны беларускі юбілей даваў духавенству вельмі добры повад, каб падыйсьці бліжэй да грамадзянства, каб завязаць з ім і жывую сувязь для дабра і вялічча перш за ўсё Праваслаўнае Царквы. Замест гэтага, духавенства пачало нейкую нядвузначную ігру, падсоўваючы грамадзянству, адухоўленаму народнай ідэяй, афіцыяльных або „ўрадавы" малебен, да слова сказаць, прайшоўшы, — як і трэба было чакаць, — пры поўнай адсутнасьці каго-колечы з грамадзянства. Духавенства аб усёй стварыўшайся сытуацыі было своечасна паінфармована і папяраджана і добра ведала, які „соблазнъ" можа выклікаць яго адмова, і аднак на гэта пайшло.

Юбілейны Камітэт і Беларускі Нацыянальны Камітэт лічылі-б сябе ў праве ўглядзіць у гэтым выхаў, кінуты ўсяму беларускаму грамадзянству і народу, калі-б ня бачылі вачавіднай несамастойнасьці і залежнасьці духавенства ад вонкавых уплываў.

Юбілейны Камітэт і Беларускі Нацыянальны Камітэт, у асобах сваіх праваслаўных прадстаўнікоў, маюць гонар прадставіць гэты мэморыял Вашаму Блажэнству на ласкавы разгляд.

Вільня, 30 траўня 1933 г.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.